# ХТО ПРАЦЯГНЕ НАШ РОД, — МОМАНТУ»

ёсць санкцыі, няма санкцый — яны хочуць жыць, яны хочуць працаваць. А час выбраў начальнікамі нас. І мы павінны зрабіць усё, каб нашы людзі жылі, працавалі і маглі ўтрымліваць сям'ю, сваіх дзетак. І дзеткам трэба варушыцца, трэба сваіх дзяцей прывучаць да працы». Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ў Беларусі аказваецца ўсялякая падтрымка шматдзетным сем'ям. Напрыклад, тым сем'ям, у якіх выхоўваецца пяцёра і больш дзяцей, дапамагаюць пабудаваць дом, выдзяляюць зямельныя ўчасткі. Але, як паказвае досвед, часта такія дамы і ўчасткі не дагледжаюцца. Узнікае пытанне: навошта тады дзяржава траціла сродкі і будавала гэтыя дамы, калі да іх так нядбайна ставяцца?

«Давайце глядзець праўдзе ў вочы, я да вас не падлашчвацца прыехаў. Не будзем укалваць — загінем. Іншага няма шляху. Пакуль яшчэ не прыдумалі, чым замяніць працу. Як хочаце мяне разумейце. Галоўнае — магчымасць. Дзяржава павінна даць магчымасць», — заявіў Прэзідэнт. Магчымасць сёння ёсць, таму трэба ёй карыстацца і працаваць, і не толькі для сябе, але і для будучых пакаленняў. «Клопат аб дзецях, унуках, усіх, хто працягне наш род, усіх, хто прыйдзе пасля нас, — сутнасць сённяшняга моманту і сутнасць ідэі сённяшняга мерапрыемства», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што праз нейкія 50-100 гадоў, улічваючы развіццё інфармацыйных тэхналогій, пра сучасных беларусаў будуць ведаць усё і нават больш. «Але ці будзе гэта веданне ісцінай? Ці ўбачаць беларусы будучыні ў масіве інфармацыі нашы сапраўдныя намеры? Таму мы і пакідаем тут пасланне. У ім нашы шчырыя надзеі, і ўсе яны прадыктаваны імкненнем да міру і стваральнай працы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

## МЫ КАПАЕМ ЗЯМЛЮ ПОБАЧ З ГРАНІЦАЙ. АЛЕ МЭТЫ Ў НАС РОЗНЫЯ

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што закладванне капсулы на месцы будаўніцтва бальніцы — гэта яшчэ і своеасаблівае пасланне нашым суседзям: «Пакуль ішоў сюды, да будаўнічай пляцоўкі, злавіў сябе на думцы: мы ж цяпер таксама капаем зямлю, як і яны, зусім побач з граніцай. Толькі мэты ў нас розныя. Там капаюць акопы, траншэі... Павялічваюць выдаткі на ўдарныя ўзбраенні. А мы тут дзве трэці бюджэту рэгіёна накіроўваем на сацыяльную сферу. Мы хочам пабудаваць мірную будучыню. Мы настроены толькі на стваральную працу», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заклікаў не верыць заявам аб тым, што Беларусь хоча ваяваць. Але прызнаў, што мы рыхтуемся ваяваць, але гэта ўжо не навіна, бо гучыць часта. Логіка простая: хочаш міру — рыхтуйся да вайны. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, гэта вельмі правільная думка. «Калі адтуль нехта падвывае і нас крытыкуе — ведайце, мы робім правільна. Калі нас пачнуць хваліць — бяда. Мы нікому не пагражаем, нам не трэба некаму пагражаць. Мы не хочам чужой зямлі, нам гэтую дай бог апрацаваць», — сказаў Прэзідэнт. Ён яшчэ раз звярнуў увагу, што да ўсяго трэба ставіцца адказна і думаць на перспектыву. І зноў знаёмы прыклад. Прыбраныя з палёў камяні дазволяць захаваць сельскагаспадарчую тэхніку і не траціць грошы на яе рамонт. Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт, што сёння трэба быць ашчаднымі як ніколі. Гэта ашчаднасць і выратавала беларусаў. Прэзідэнт падкрэсліў, што сёння ў краіне вялікія планы і яны будуць рэалізаваныя, бо трэба зрабіць задзел для будучых пакаленняў. Гэта галоўнае. «Мы павінны зрабіць так, каб нашы дзеці, абапіраючыся на тое, што зрабілі мы, зрабілі больш, — сказаў ён. — Трэба сёння зрабіць максімум. Бо мы не ведаем, будуць нашы дзеці такімі ж, змогуць яны працаваць так, як мы. Пакуль я гэтага не бачу. Як бы моладзь ні захвальвалі, пакуль я гэтага не бачу».

## ТРЭБА ШАНАВАЦЬ СВАЁ

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што хацеў прыехаць на старт гэтай будоўлі, пабываць на захадзе Беларусі. «І яшчэ раз ад першай асобы сказаць вам, што вы нашы, што мы вас нікому не аддадзім», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што сваю палітычную кар'еру ён пачынаў на Гродзеншчыне. І тады мясцовыя жыхары аказалі давер маладому палітыку. Што да суседзяў па граніцы, з якімі ў гродзенцаў, ды і ва ўсіх беларусаў, заўсёды былі сяброўскія адносіны і якія сёння адгарадзіліся плотам, то, па словах Прэзідэнта, гэта іх справа. Ён звярнуў увагу, што тыя, хто прымае такія рашэнні за мяжой, кіруюцца не інтарэсамі сваіх грамадзян, а маюць свае карыслівыя мэты, нажываючыся на будаўніцтве агароджаў. Беларусь на гэтым фоне, наадварот, адкрытая для наведванняў, увяла бязвізавы рэжым, на што заходнія суседзі сталі палохаць сваіх грамадзян верагоднасцю вярбоўкі ў Беларусі. «Гаспадзь з вамі, не трэба мне гэта вярбоўка. Хто ж так вярбуе? Каго трэба, мы ўжо даўно завербавалі», — заўважыў Прэзідэнт.

«Мы гэта перажывём. Мы хочам мірнага жыцця. Я не хачу, каб нашы людзі ваявалі. Гэта з асабістага. А з дзяржаўнага таксама, я паўтараю пастаянна: нам чужога не трэба. Чужы кавалак ірве раток. Так у народзе гаварылі, я гэта засвоіў са свайго вясковага жыцця. Я не хачу нічога чужога. І заўсёды кажу: не чапай чужое — бокам вылезе. І вам хачу завяшчаць: чужога не чапайце. Рана ці позна гэта ператворыцца ў катастрофу, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Я хачу, каб вы, вашы дзеці і ўнукі жылі ў спакойнай мірнай краіне. Пакуль я Прэзідэнт, пакуль мае памочнікі працуюць тут і па ўсёй краіне, мы будзем праводзіць гэту палітыку».

Аляксандр Лукашэнка не проста выступіў перад гараджанамі, але і асабіста пагаварыў з людзьмі. «Гродзенцы — проста малайцы, — сказаў ён. — Хацелася б, каб вашы людзі тут жылі, працавалі, лячылі, ад гэтага нікуды не падзенешся». Кіраўнік дзяржавы заклікаў трымацца разам і не сварыцца, як бы ні было цяжка: «У нас зямлі дастаткова. А калі ёсць свая зямля — тады і жыць будзем нармальна». Па яго словах, можна ездзіць за мяжу, глядзець, як там што, але трымацца трэба за сваё, не губляць карані. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што тыя, хто з'ехаў у 2020 годзе, сёння хочуць вярнуцца, звяртаючыся ў адпаведную камісію пад старшынствам генпракурора Андрэя Шведа. «Трэба шанаваць сваю зямлю. Сваё трэба шанаваць, каб потым не прасіцца назад. Вядома, людзей шкада. Яны тады ў сацыяльных сетках усё паказвалі сябе. А сёння мы бяром гэтыя сеткі і глядзім, хто чым займаўся. Хто там у першых шэрагах ішоў і гатовы быў забіваць з нажамі, сякерамі. А хтосьці ачмурэў проста ад пандэміі і іншае. Людзі павінны мець права на памылку. Таму і створана гэтая камісія, і працягнулі яе паўнамоцтвы», — сказаў ён. Беларускі лідар падкрэсліў, што тых, хто ўсё зразумеў і ўсвядоміў, трэба вяртаць да жыцця. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што беларусы заўжды былі адкрытыя і шчыра настроеныя да іншых народаў. «Простыя палякі і літоўцы да нас добра ставяцца. Разумеюць нас. І мы павінны па-беларуску так. У нас жа сумесь: палякі, яўрэі, беларусы, рускія, украінцы. Гэта самы якасны народ. І мы павінны быць такімі, гнуткімі, акуратнымі», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Вы не хвалюйцеся. Будзе так, як я кажу. У мяне падвойнага дна ў палітыцы няма. Будзе так, як будзе выгадна нашым людзям ад Гродна да Оршы», — запэўніў Прэзідэнт.

## КРЫТЭРЫЙ АДЗІН — ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ І ТАК, ЯК ЛЕПШ ДЛЯ КРАІНЫ

Прэзідэнт таксама наведаў новую шкляную вытворчасць ААТ «Гродзенскі шклозавод», у прыватнасці яго вытворчую пляцоўку «Аульс». Ва ўсім свеце няма выпадкаў, калі б за пяць гадоў у чыстым полі была пабудавана такая вытворчасць. Беларускі аб'ект пабудаваны за два гады — рэкордныя тэрміны. Беларускае прадпрыемства стваралася падчас пандэміі, ва ўмовах санкцыйнага ціску. Але айчынныя спецыялісты ўсё вытрымалі і прайшлі вялікую навуку.

Прэзідэнту далажылі аб рэалізацыі інвестыцыйнага праекта «Стварэнне вытворчасці шкляной тары з выкарыстаннем інавацыйных, энергаэфектыўных і рэсурсазберагальных тэхналогій». Па выніках рэалізацыі гэтага праекта арганізавана вытворчасць шклатары на трох лініях шклаварнай печы прадукцыйнасцю 220 тон у суткі, створана 104 рабочыя месцы, на якіх занятыя 279 чалавек.

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з сучаснымі тэхналогіямі распрацоўкі і выпуску вырабаў са шкла. Генеральны дырэктар кіруючай кампаніі холдынга «Беларуская шкляная кампанія» Юрый Скрыпко расказаў, што прадпрыемства можа выпускаць да 200 мільёнаў штук вырабаў тары, 60 мільёнаў тон у год. Вытворчасць арганізавана па апошнім слове тэхнікі і тэхналогій.

Прэзідэнту паказалі сыравіну для вытворчасці шкла, прыродныя матэрыялы, якімі не надта багатая наша краіна, і тое, што ляжыць літаральна пад нагамі, — шклабой. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што трэба максімальна выкарыстоўваць тое, што ёсць, каб не купляць тое, чаго няма, бо ашчаднасць сёння вельмі важная. Юрый Скрыпко падкрэсліў, што працаваць са шклабоем больш зручна і выгадна, чым з прыроднымі матэрыяламі. Калі апрацоўваецца шклабой, таксама ўтвараюцца адходы, адсеў, дробная фракцыя шкла, якую ў шкловарэнні ўжываць нельга. І гэтыя адходы або адпраўляцца на звалку, або атрымліваюць новае жыццё — іх успеньваюць. Па словах Юрыя Скрыпко, успененае шкло — гэта ўцяпляльны матэрыял, які валодае выключнымі характарыстыкамі, не гарыць, не тоне, даволі трывалы. «У нас ёсць сыравіна. І мы з гэтага можам зрабіць добры тавар», — заўважыў Прэзідэнт, таму ён даручыў ураду ўзяць гэтае пытанне на кантроль.

Галоўны пасыл Прэзідэнта падчас наведвання шклозавода — дзейнічаць у дзяржаўных інтарэсах і так, каб быў эфект. Таксама Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ведае ўсё, што робіцца на месцах. Таму ніякай хлусні быць не павінна, гэта датычыцца і членаў урада, і мясцовых улад, і кіраўнікоў прадпрыемстваў. «Ваш падман прывядзе да таго, што будуць прыняты няправільныя рашэнні. Хлусні быць не павінна! Крытэрый адзін — эфектыўнасць і так, як лепш для краіны», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы прайшоўся па цэхах завода, сучасных і зручных. Напрыклад, у сыравінным цэху прадугледжаны ўсе ўмовы, каб выключыць староннія негатыўныя ўздзеянні, якія могуць паўплываць на канчатковую якасць тавараў. Цэхі на прадпрыемстве максімальна аўтаматызаваныя. Увесь вытворчы працэс арганізаваны так, каб мінімізаваць шкоднае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе. «Асаблівасцю гэтага завода можна адзначыць так званую ўтылізацыю цяпла. Гэта значыць, завод выкарыстоўвае цяпло газаў самой печы, якія адыходзяць пры варэнні, пераўтварае гэтую энергію і мы самастойна сябе забяспечваем гарачым водазабеспячэннем і ацяпленнем», — распавёў генеральны дырэктар Гродзенскага шклозавода Дзяніс Юрчанка. Што датычыцца непасрэдна прадукцыі, то на заводзе можна вырабіць бутэлькі і слоікі самых розных памераў, што вельмі актуальна для многіх беларускіх прадпрыемстваў. Гэта і прадэманстравалі Прэзідэнту на невялікай выстаўцы прадукцыі завода.

Нараўне з бягучай дзейнасцю на прадпрыемстве на пастаяннай аснове ажыццяўляецца інвестыцыйная. У прыватнасці, у 2023—2024 гадах на дзеючай пляцоўцы ААТ «Гродзенскі шклозавод» запланавана рэалізацыя інвестыцыйнага праекта «Тэхнічная мадэрнізацыя тэхналагічнай лініі шклаварнай печы № 7 цэха пракатнага шкла і шклатары ААТ «Гродзенскі шклозавод» па адрасе: г. Гродна, вул. Суворава, 40» агульным коштам 93 млн рублёў. Праект прадугледжвае абнаўленне маральна і фізічна зношанага абсталявання па вытворчасці шклатары.

Падводзячы вынікі наведвання шклозавода, Прэзідэнт падкрэсліў, што, калі будзе ідэя, карысная і абгрунтаваная, яна будзе рэалізоўвацца. «Толькі хаваць, красці не трэба. І ўсё будзе нармальна», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы таксама пакінуў свой запіс у кнізе ганаровых гасцей Гродзенскага шклозавода. Запіс пад нумарам адзін. «Вы не павінны нікога баяцца, калі вы добра працуеце. Калі чалавек нечага баіцца — чакай бяды», — на развітанне параіў Прэзідэнт.

**Валерыя СЦЯЦКО,**
*Гродна.*

**У тэму**

## ТАРНАЯ ГАЛІНА Ў КРАІНЕ ПАВЯЛІЧВАЕ МАГУТНАСЦІ

У размове з журналістамі генеральны дырэктар Гродзенскага шклозавода Дзяніс Юрчанка падкрэсліў, што галоўная асаблівасць гэтага прадпрыемства — тое, што адзіны выпадак за пяць гадоў у свеце, калі ў чыстым полі з нуля быў пабудаваны шклатарны завод.

«Тэхналогіі, электрападагрэў, абсталяванне, размешчанае ў дадзенай пляцоўцы, — гэта самае лепшае, што было апошнім часам. Мы гэта змаглі атрымаць, мы гэта змаглі прывезці, мы гэта змаглі ўстанавіць, і гэта запрацавала. Тое, аб чым марыла ўся каманда Гродзенскага шклозавода, тое, што падтрымаў Прэзідэнт, мы ўвасобілі ў жыццё», — сказаў ён.

Дзяніс Юрчанка адзначыў, што сёння няма праблем з рэалізацыяй іх прадукцыі: «Першапачаткова завод будаваўся, каб задаволіць патрэбы ў шклатары піўных холдынгаў. Мы павінны былі ў нейкай меры замяшчаць іх патрэбы. Але яны палічылі, што ім яшчэ рана звяртацца да шклатары. І так атрымліваецца, што завод запушчаны і тыя аб'ёмы, якія ён гатовы вырабляць, вырабляе на існуючы рынак, нягледзячы на піўныя холдынгі. І калі ім чарговы раз спатрэбіцца шкло, а гэта палітыка дзяржавы і Прэзідэнта — адысці ад пластыку да шкла, атрымаецца, што ім спатрэбіцца яшчэ два-тры такія прадпрыемствы. А на тым, што мы на першапачатковым этапе будавалі для іх, мы змаглі замясціць усе аб'ёмы на той жа ўнутраны рынак або экспартныя пазіцыі».

Генеральны дырэктар Гродзенскага шклозавода нагадаў, што некалі стаяла пытанне аб існаванні тарнай галіны ў краіне, а само прадпрыемства было практычна банкрутам. Тады, дзякуючы Прэзідэнту, ураду, банкірам, якія паверылі ў гэтае прадпрыемства, яго ўдалося захаваць. «Тарная галіна ў Рэспубліцы Беларусь не тое што развіваецца — яна працягвае павялічваць магутнасці, памнажае сваю вытворчасць у разы. І мы прыйшлі да таго, што ў 2023 годзе запусцілі абсалютна новую вытворчасць, чым сёння ганарымся», — падкрэсліў Дзяніс Юрчанка.